УДК 94(476):27

# ВЫТОКІ САЦЫЯЛЬНАГА СЛУЖЭННЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ: ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ

**Шчэрбін Марына Міхайлаўна,**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца гістарычныя вытокі сацыяльнага служэння як рэлігійнай катэгорыі, маральнага прынцыпу і асобаснай якасці. На падставе аналізу творчай спадчыны беларускіх мысліцеляў вызначана дэтэрмінаванасць разумення сацыяльнага служэння хрысціянскім светапоглядам і гістарычнымі абставінамі быцця.*

Сацыяльнае служэнне ў сучасных умовах часцей за ўсё успрымаецца праз дачыненне да патрыятычный абароны Радзімы або ў сувязі з дабрачыннай рэлігійнай дзейнасцю. Аднак гістарычныя ўмовы развіцця беларускіх зямель акрамя безумоўнай сувязі з хрысціянствам, паўплывалі таксама на разуменне сацыяльнага служэння ў кантэксце наладжвання справядлівых асноў грамадскага жыцця і годнага выхавання маладых пакаленняў.

Сярэдневяковы філосаф Ф. Аквінскі звяртаў увагу на тое, што разам з "выратаваннем душы", галоўнай каштоўнасцю, што арыентуе паводзіны чалавека, павінна стаць "благо другіх людзей" [1, с. 51]. Гэта перакананне адпавядала хрысціянскім прынцыпам агульнага жыцця, адлюстроўвала асаблівую ўвагу да ўзаемаадносін чалавека з соцыумам, у аснове якіх павінна быць дабро і справядлівасць. Менавіта яскрава выражаная альтруістычна-рэлігійная скіраванасць сацыяльнага служэння была характэрна для ўсходнеславянскіх зямель перыяда ранняга Сярэднявечча. У гэты час сацыяльнае служэнне ажыццяўлялася праз асабістую ахвярнасць і непраціўленне злому (напрыклад, святыя-страстацерпцы Барыс і Глеб, Свяшчэннамучанік Макарый, мітрапаліт Кіеўскі і інш.).

Неабходнасць быць карысным іншым людзям як значную асобасную якасць чалавека вылучалі старажытныя крыніцы, падкрэсліваючы, што *"человек добрый тот, кто пользу приносит"* [4, с. 486]. Пры гэтым хрысціянскі светапогляд арыентаваў на падтрымку пэўнай грамадскай структуры як неад'емнага атрыбуту сацыяльнага кампрамісу. Па гэтай прычыне такая карысць суадносілася побач з рэлігійнымі справамі, яшчэ і з выкананнем асобай грамадскіх функцый, накіраваных на мір і згоду.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У сувязі з гэтым агульную вядомасць і ўсхваленне на беларускіх землях набылі людзі, якія "ўпрыгожылі" сябе добрымі справамі, – Кірыла Тураўскі і Ефрасіння Полацкая.

Рэлігійна-асветніцкай дзейнасць Кірылы Тураўскага з'явілася прыкладам увасаблення добрых спраў дзеля агульнай карысці, што насіла ярка выражаны патрыятычны характар і на стагоддзі стала ўвасабленнем спалучэння глыбокай веры і адданага служэння людзям. Сярод шэрагу дабрачыннасцей, якія вызначаюць сапраўднага чалавека, ён вылучаў найперш *"моральную чистоту, милосердие, любовь ко всем"* [3, с. 152]. Кірыла Тураўскі лічыў, што толькі шчырая вера і добрыя справы дазволяць стаць на "шлях да Бога", выратуюць чалавека ад забыцця: *"Постучитесь – и откроется вам! Ищите – и обрящете! Просите – и дастся вам!"* [3, с. 154].

Вядомы хрысціянскі пастулат *"не затем пришел, чтобы мне послужили, а чтобы самому послужить"* асветнік тлумачыў літаральна: праз дабрадзейныя справы кожнага і любоў да ўсіх, назалежна ад становішча і пасады [3, с. 182]. Такі варыянт сацыяльнага служэння з падмуркам у выглядзе любові да бліжняга, закладзены Кірылам Тураўскім, знойдзе гістарычнае замацаванне ў ментальна-светапоглядных перакананнях нашых продкаў.

Ідэі Кірылы Тураўскага падзяляла беларуская асветніца Ефрасіння Полацкая. Актыўная культурна-асветніцкая дзейнасць падзвіжніцы была накіравана на агульнае дабро: распаўсюджванне *"учения книжного"*, перапісванне кніг, будаўніцтва храмаў і манастыроў – усё для магчымасці не толькі набліжэння да Бога, але і для плёну свайго народа [3, с. 297]. Прападобная паказала прыклад руплівага служэння на карысць грамадству і Айчыне.

Пэўная сэнсавая эвалюцыя ў разуменні сацыяльнага служэння назіраецца ў перыяд дзяржаўнага будаўніцтва на беларускіх землях, калі побач з мараллю асаблівая ўвага ў якасці рэгулятара чалавечых адносін надавалася праву. Погляды Ф. Скарыны таксама характарызаваліся хрысціянскай самаадданасцю і дабрачыннасцю. Мір і грамадская згода, лічыў асветнік, будуюцца на прынцыпах *"прироженого закона"*, які *"…написан ест в серци одиного кажного человека"* [2, с. 21]. Па гэтай прычыне адносіны паміж людзьмі павінен вызначаць маральны закон, сумленнасць і справядлівасць, так як *"…незгода бо и найболшие царства разрушаеть"* [2, с. 39]. Пры гэтым асветнік прызнаваў неабходнасць існавання не толькі маральных прынцыпаў, але і прапісанага права. І калі такі прапісаны закон *"почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный, подле прирожения, подлуг обычаев земли, часу и месту пригожий,… нек пожитку единого человека, но к посполитому добру написаный"* [2, с. 22], ён выступае падмуркам сацыяльнай згоды, грамадскага міру і адзінства. Перакананні першадрукара адносна сацыяльнага служэння абапіраліся на ідэі добразычлівасці і любові паміж людзьмі, якія дазволяць лепшым чынам рэалізаваць сябе ў грамадстве.

Талерантнай прыроды сацыяльнага служэння прытрымліваўся мысліцель С. Будны. Мысліцель быў перакананы: чалавек павінен быць *"богобоязненным, справедливым, милисердным"* у адносінах да іншых, што дазволіць вырашыць любыя супярэчнасці [2, с. 217]. Менавіта такая пазіцыя чалавека дазволіць яму праявіць сябе ў грамадстве без шкоды іншым людзям. Значнасць панавання



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

згоды паміж людзьмі С. Будны тлумачыў усеагульнай карысцю як для караля, які прывучаецца накіроўваць свае ўчынкі не *“к своей пользе и удовольствию, а к благу…, к удовлетворению нужд граждан земель своих”*, так і для народа з мэтай захавання міру і спакою [2, с. 218]. Асветнік падкрэсліваў значны выхаваўчы патэнцыял сацыяльнага служэння як найлепшага прыкладу для маладых пакаленняў дзейнічаць у імя агульных інтарэсаў.

Прававед А. Волан быў перакананы, што *“справедливости принадлежит первое место… в гармонии добродетелей”* [2, с. 287]. Яе сутнасць філосафам тлумачылася як дапамога тым, каму патрэбна, каб *“никто не терпел вреда, но наоборот, тот, кто нуждается в помощи, быстро получал ее”* [2, с. 291]. Па гэтай прычыне сацыяльнае служэнне разглядалася асветнікам праз захаванне міру і парадку, абароны пакрыўджаных і слабых у грамадстве: *“счастье одних не должно строится на несчастьи других”,* – быў перакананы ён [2, с. 291]. А. Волан імкнуўся садзейнічаць распаўсюджванню прававых адносін паміж саслоўямі ў ВКЛ, не выключаючы пры гэтым неабходнасці захавання *“прадпісаных ад Бога пэўных норм паводзін”* [2, с. 280], бо *“маральныя заганы – прычына вельмі цяжкіх бядотаў многіх дзяржаў”* [2, с. 281]. З гэтай нагоды выхаванню дабрачыннасці і справядлівасці, на думку філосафа, трэба надаць асаблівую ўвагу ў выхаванні маладога пакалення, прывучаць моладзь да служэння сваёй Радзіме, народу, грамадству.

Такім чынам, вытокі сацыяльнага служэння на беларускіх землях бяруць пачатак з хрысціянскага светаўспрымання быцця на аснове саборнасці, яднання і міру. Знаходзяць працяг у грамадскай згодзе перыяду полікультурнага і поліканфесійнага грамадства ВКЛ і неабходнасці годнага выхавання моладзі на традыцыях адданасці, вернасці і дабра.

## Літаратура


1. Гуревич, А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гурeвіч – М. : Искусство, 1984. – 350 с.
2. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО “МГУ им. А.А. Кулешова”, 2010. – 332 с.
3. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО “МГУ им. А.А. Кулешова”, 2009. – 396 с.
4. Пчела // Памятники литературы Древней Руси: XIII век / вступ. статья Д.С. Лихачева ; общ. ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М. : Худож. лит., 1981. – С. 474–486.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова